Сталин знал, что делал. И дома, построенные в его время, — на века. И мораль — тоже. Потому по-прежнему надежно отгорожены от нормальных людей рядами проволоки советские граждане. По-прежнему бдительные пограничники высматривают на вспаханной полосе следы шпионов, переходящих границу на свиных копытиках. Об этом уже писано-переписано, но высокие разрешители молча глотают стрелы прессы и действуют по принципу героя известной басни — «А Васька слушает, да ест».

Сколько же, в конце концов, можно нас есть?

Купив билет из Бреста, скажем, в Тересполь, у вас нет совершенно никаких гарантий, что вам удастся сесть в свой поезд. Таможенный досмотр проводится не на конкретных поездах, а скопом. Некоторые пассажиры не могут пройти таможенный зал и за сутки. Если бы Брест и Тересполь располагались по обе стороны границы в более цивилизованном месте, то вы пешком быстрее пришли бы из города в город, чем нынче через таможенный зал железнодорожного вокзала.

Потому и рождается у нас исключительно отечественный, непонятный миру дикарский бизнес — продажа места в очереди. Цена за него подскакивает иногда до нескольких тысяч рублей. Если речь идет об автомобильной очереди у шлагбаума.

Когда смотришь на работу таможенников, их становится жалко. Взопревшие, раскрасневшиеся, они без устали много часов кряду перекапывают сумки и чемоданы, слышат в свой адрес, мягко говоря, нелестные выражения, молча сносят их и методично делают свое дело. И днем, и ночью. Все это — за чисто символическую по сегодняшним меркам зарплату. Неужто дозорные наших чемоданов в ущерб семье трудятся только во имя охраны интересов родного Отечества? Неужто истинные патриоты собрались именно в этой службе?

Если постоять у КПП, можно сделать и другие любопытные наблюдения. Проезжают сквозь кордон «Жигули» с доверху груженым прицепом. Можно понять, если, скажем, торгпредство везет оборудование для своего офиса. Но если это частник, то как-то не укладывается в существующую концепцию пограничного режима.

Доводилось читать в «Комсомольской правде», что место таможенника на Украине стоит 25 тысяч рублей и окупается за пару недель. У нас, конечно, не так. Но как именно на самом деле, мы вряд ли когда-нибудь узнаем.

Независимая Беларусь приняла под свою юрисдикцию пограничную и таможенную службы, однако взоры наши по-прежнему обращены к Москве: сколько дадут оттуда свободы для белорусских граждан? Хотя давно пора самим ратифицировать все международные пакты по правам человека, принять свой закон о свободе передвижения, достойный цивилизованного государства. Какие-то переговоры по этому вопросу Председатель Совета Министров БССР В. Ф. Кебич вел в Польше во время своего недавнего визита, но что-либо вразумительное о свободе передвижения граждан двух соседних стран нам пока не сказали.

Необходимо поставить и еще один вопрос: во что обходится наша западная граница и нужна ли нам она в таком виде? Речь идет не о пустячках, а по меньшей мере о миллиарде рублей. Догадка, конечно, приблизительная, ибо цифры по-прежнему скрываются, дабы нищий наш народ не ужаснулся, какие деньжищи гробятся на содержание своры собак, вспахивание полос, всякие там сигнализации и т. п.

Все эти мучительные для нас вопросы уже не беспокоят соседей за Бугом. Министр иностранных дел Кшиштоф Скубишевский подписал недавно в Берне соглашение об отмене виз для польских граждан, выезжающих в Швейцарию. Это уже 19-я страна, с которой заключено такое соглашение в последнее время. Да и другие характерные черты, отличающие коммунистические режимы от нормальных, в стране исчезли. Забыты очереди и карточки. Варшава расцветилась броской рекламой, приглашающей покупать японскую электронику и западные автомобили. Убран наконец-то шаромыжный базар у подножья Дворца культуры и техники, где можно было по бросовым ценам приобрести достижения развитого социализма в сфере товаров народного потребления.

Нашим туристам, выехавшим в Польшу автобусом «Спутника», не позавидуешь. Рынок товаром наводнен, торговаться времени нет. Жить негде, злотых на питание жалко. День на базаре — и домой. О каких-либо экскурсионных целях и речи нет. Не до всяких там достопримечательностей советскому человеку, когда в родной стране ни трусы, ни носки не купишь.

Вообще, может, пора нам перестать кривить душой и называть вещи своими именами. Да, торговый тур. Ну и что тут зазорного? Поляки уже давно развивают самый разнообразный целевой туризм. Наш же ограничивается рамками «приехали — уехали», «продали — купили». Причем эта туристическая услуга предоставляется в бескультурнейшей по европейским меркам форме.

**На улице Мицкевича в центре Варшавы находится туристическое бюро «Ин-Пол». Все его предложения исключительно заманчивы. «Ин-Пол» приглашает в поездки не на задрипанном «Икарусе», а на автобусе-люкс «Бова-Футур» с кондиционером, туалетом, холодильником, видео, баром.**

**Стоя перед рекламным стендом, не знаешь, что и выбрать. Можно поехать в Голландию специально для того, чтобы купить легковой автомобиль. Группу сопровождает специалист, который поможет сделать выбор, оценить достоинства и техническое состояние автомобиля. Ведь многие хотят купить машины подешевле, т. е. бывшие в употреблении.**

**Можно поехать на 4—5 дней в гости к бельгийским фермерам, вместе с ними поработать, изучить опыт. Можно отправиться в Англию на краткосрочные специальные языковые курсы. Группы формируются по интересам — бизнес, торговля, туризм и т. д. Одним словом, туристическая фирма стремится всячески ублажить своего клиента, исполнить максимум его желаний. Это результат конкурентной борьбы. И потому цены на такие поездки не очень высокие, укладываются в размер месячного заработка.**

**Мы же пока готовы за любые деньги ехать в любую страну, на любом автобусе-душегубке. Только бы пустили.**

Думаю, когда наконец-то снесут унизительную загородку на рубежах страны, через некоторое время желающих куда-то вырваться будет становиться все меньше и меньше. Наличие выбора — одно из условий свободы личности. Польша уже почти дождалась этого. Мы пока начинаем ждать. Весь вопрос: дождемся ли и когда?

**Иван ГЕРАСЮК,**
**обозреватель «Народной газеты».**

## Кроўная сувязь

**Галоўнаму рэдактару «Народнай газеты».**

**З прыемнасцю прачытаў і праслухаў бунтоўна-ўзнёслую паэму Валерыя Грышановіча. Яна вартая таго, каб быць апублікаванай у Вашай паважанай газеце. Яна патрэбная. Яна буяе, будзіць заснулае сумленне беларусаў. Гэтыя радкі мае — радасць знаёмства з надзённай, публіцыстычнай паэзіяй, якой гэтак не стае апошнім часам.**

**Ваш Рыгор БАРАДУЛІН.**

### *Ад аўтара*

Гістарычнае рашэнне прыняў беларускі парламент, вярнуўшы народу яго нацыянальныя сімвалы. Гэта рашэнне, як ачышчальная маланка, было бачна яшчэ ў жнівеньскія дні нам, удзельнікам вандроўкі, арганізаванай аб'яднаннем беларусаў свету «Бацькаўшчына» па Волзе з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Яна праходзіла ў цэнтры Расіі пад бел-чырвона-белым сцягам і гербам «Пагоня». Велізарны сэнс і значэнне апошняга з магутнай сілай выразіў вечна юны пясняр Беларусі, чыё жыццё яркай зоркай праляцела на небасхіле і так трагічна абарвалася ўдалечыні ад Радзімы. Нагадаю, што ўпершыню «Пагоня» была надрукавана 30 лістапада 1917 года ў газеце «Вольная Беларусь». Паэма надзеі «Пагоня» вяртаецца на Беларусь» нарадзілася 1 верасня сёлета, была прачытана ў час адкрыцця музея М. Багдановіча ў горадзе Яраслаўлі.

Верш Максіма Багдановіча, які натхняў і натхняе мяне на творчасць, прашу «Народную газету» надрукаваць як уступ да маёй паэмы.

### *Максім БАГДАНОВІЧ*

# ПАГОНЯ

*Толькі ў сэрцы трывожным пачую*
*За краіну радзімую жах,—*
*Ўспомню Вострую Браму святую*
*І ваякаў на грозных канях.*

*У белай пене праносяцца коні,—*
*Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...*
*Старадаўняй Літоўскай Пагоні*
*Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.*

*У бязмерную даль вы ляціце,*
*А за вамі, прад вамі — гады.*
*Вы за кім у пагоню спяшыце?*
*Дзе шляхі вашы йдуць і куды?*

*Мо яны, Беларусь, панясліся*
*За твоімі дзяцьмі ўздагон,*
*Што забылі цябе, адракліся,*
*Прадалі і аддалі ў палон?*

*Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,*
*Не давайце чужынцамі быць!*
*Хай пачуюць, як сэрца начамі*
*Аб радзімай старонцы баліць...*

*Маці родная, Маці-Краіна!*
*Не ўсцішыцца гэтакі боль...*
*Ты прабач. Ты прымі свайго сына,*
*За Цябе яму ўмерці дазволь!..*

*Усё лятуць і лятуць тыя коні,*
*Срэбнай збруяй далёка грымяць...*
*Старадаўняй Літоўскай Пагоні*
*Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.*

*1916 г.*

### *Валерый ГРЫШАНОВІЧ*

# «ПАГОНЯ» ВЯРТАЕЦЦА НА БЕЛАРУСЬ

## (ПАЭМА НАДЗЕІ)

*Усё лятуць і лятуць тыя коні,*
*срэбнай збруяй далёка*
*грымяць...*
*Максім БАГДАНОВІЧ,*
*1916 г.*

Пад градам няспынным
каменняў,
пад грай не птушыны,
а ядраў чыгунных,
пацэленых
ў нацыі цела,
пад скрыгат
іклатай
шалёнай
ад чырвані
зграі
вятрыста, крылата
ляцела,
ляцела,
ляцела —
Пагоня!
Агонь і Агонія!
Азорана неба
спустошанай
Маці-Краіны
зоркай Венерай —
новая эра!
Хрыстос уваскрэс
у Менску,
Гародні...
Гараць абабітыя скурай
ш ч ы г р ы н а в а й
троны і крэслы...
Са скуры ж ваўчынай
вылузваюцца,
ў статак збіваюцца,
непрыкаянна
каюцца
неакаінаўцы,
гора-васалы,
цароў цараняты,
а ў душах — авечкі.
Зацепліце свечкі!
Васал, зняславіўшы
мову маю і народа,
часовы, бязродны.
У Веры Святой і Адзінай
Народ — Бессмяротны!
Смяротна стаміліся белыя коні.
Спыніліся на скрыжаванні
р а с х р ы с т а н ы х
з клубамі пылу — дарог.
Бязмерна пакутныя людзі
зямлі беларускай
насустрач Пагоні
выносяць іконы.
Рамонкі цалуюць
іх ногі,
пазбітыя
ў кроў.
Жыватворныя росы
іх поіць...
Сама Багародзіца,
як напрадвесні,
склікае гракоў.
Чужынец!
Вяртайся
з далёкага
выраю.
Я раю:
спрадвечнай Пагоні
ў пояс ніжэй
пакланіся.
Ты тут,
у краіне тугі
і самоты,
умытай аблокамі
боскімі слёз,
на свет
нарадзіўся
і рос.
А мо
пры жаданні
і ты прыгадаеш
маўклівы пагост,
гаманлівы раздольны
пакос?!
Павіннага
сына аблуднага
меч не сячэ,
калі ў яго сэрцы
рачулка дзяцінства
цячэ
Даўно патапіўшы віну
у віне,
як чорт — безаблічны,
ці д'ябал бязвінны,
пад небам Краіны
свабоднай,
ікаючы
як Каін,
табе застаецца
крыха невялікая:
нястрымнай Пагоні
прынесці,
нарэшце,
даніну.
Таварыш!
Я з лесвіцы
камуністычнага раю,
што крута
абрынуўся
ўніз,
параю:
у рэшце рэшт атаварыўшы
(на авёс ці на жыта)
з наздроўскім нахрапам
рулоны талонаў,
з тоны —
хоць жменьку
зярнятак,
(якіх растаптаў бы
«жалезны парадак»!)
без стогну
ад казны і сябе адарві
і велічных коней,
якія не здрадзілі
Маці-Краіне,
імкнулі да нас
па калена ў крыві, —
з дрыготкіх
вільготных далоняў
кармі!..
Хоць раз у жыцці,
перапёлкай у жыце
паплач,
калі ты
народу свайму
не крумкач.
А лепей у храме, ці келлі,
калі — толькі! — цепліцца
сорам пякельны,
ты стань
на —
ка-ле-ні!..
Няхай камарылля
ў здранцвенні
няхай апявае заплыўшых
далёка
з ігрышча іх ідалішч,
чый перакульнуўся
човен учора.
Я веру,
што
ночы ўчарашняй
паўзучыя змрочныя цені
нашчадкам маім
нагадаюць
не страх,
а бяскрылых хрушчоў.
Я веру,
што сцягам дзяржаўным
пасля адпявання татальнай
«кастрычніцкай ночы»
ўчарашняй
палі
і дубровы
і сам Усявышні
абвесціць навечна — Бясстрашша!
Маўчанне травы
і сумлення маўчанне,
жаданне гняздо крумкачоў
пад сцягам кума-кумачовым
на абпаленым дрэве
зноў звініць, —
касіце касой і будзіце
не стрэлам з бярданкі:
па-рыцарску востра
мячамі,
мячамі... —
пад велічны спеў
пракаветных
дуброў,
што
ў сэрцы
звініць.
Агонь і Агонія!
Пад зоркай Венерай,
пад зоркай Венерай
наўперадзе зграі
ваўчынай паганай
да нас даляцела
на Яблычны Спас
цудадзейна — Пагоня!
З Надзеяй і Верай,
з Надзеяй і Верай
яе сустракае Айчына
і сцеліць на долы
і долю
васількові абрус
хрышчоная горам
і небам
святая свабодная
Маці Краіна,
Адзіная ў свеце,
мая
і нашчадкаў
маіх —
Беларусь!..
Яраслаўль — Мінск

**Ганарар за паэму аўтар перадае на аднаўленне Успенскай царквы ў мястэчку Халопенічы — радзімы вядомага этнографа і гісторыка Адама Ягоравіча Багдановіча — бацькі аўтара бессмяротнай «Пагоні».**

## Пару слоў для прэсы

### *Ніна МАЗАЙ:*

# «Прыняць рашэнне аб адстаўцы мне было цяжка...»

**На пытанні аглядальніка «Народнай газеты» адказвае экс-намеснік Старшыні Савета Міністраў рэспублікі**

**— Ніна Мікалаеўна, Ваша адстаўка з пасады намесніка Старшыні Савета Міністраў рэспублікі была нечаканай і засталася да гэтага часу загадкавай. Што прымусіла Вас пакінуць пасаду віцэ-прэм'ера?**

— На пасадзе намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларусі я працавала шэсць з палавінай гадоў. Гэта, пагадзіцеся, не такі малы тэрмін. На маю думку, працаваць давялося ў вельмі складаны час, калі нельга было не адчуваць, не разумець неабходнасці сапраўдных перамен у дзяржаўнай палітыцы ў адносінах да тых пытанняў, якімі даводзілася займацца мне. Каб гэтыя перамены пачыналіся на практыцы, неабходны былі і настойлівасць, і сілы, і цярпенне. Не так хутка, як хацелася б, адкрываліся магчымасці працаваць над найважнейшымі праблемамі, вызначаць шляхі іх вырашэння, кіруючыся нармальнымі прынцыпамі.

Я вельмі рада, што сёння ў суверэннай дэмакратычнай дзяржаве з'явіліся новыя магчымасці (складанасцей хопіць) больш актыўна, больш эфектыўна будаваць дзяржаўную палітыку ў адносінах да нацыянальнай культуры, адукацыі, якая грунтуецца на навуцы, з павагай адносіцца да нашай зямлі, да народа.

Прыняць рашэнне аб адстаўцы мне было цяжка. Яшчэ жыву тымі праблемамі, яны застаюцца часткай майго жыцця. Але думаю, што зрабіла правільна.

**— Аб якіх неажыццёўленых тады планах Вы зараз шкадуеце?**

— Фактычна і законы, і законапраекты аб мове, культуры, адукацыі, сацыяльнай абароне насельніцтва, што прыняты ці абмяркоўваюцца цяпер, былі «закладзены» і напрацоўваліся яшчэ пры мне. Я вельмі ганаруся, што маю дачыненне да гэтых заканадаўчых дакументаў. Шкадую толькі аб тым, што некаторыя з нават прынятых законаў яшчэ як трэба не працуюць. Не ўсе абяцанні выконваюцца.

**— Раскажыце, калі ласка, аб сваёй цяперашняй працы.**

— Працую загадчыкам аддзела Савета Міністраў. Аддзел створаны нядаўна, якім будзе — пытанне на заўтра.

**— А ці не паступалі Вам больш цікавыя прапановы наконт працаўладкавання?**

— Дакладней прапанова.

**— Якая?**

— Пакуль што магу сказаць адно — яна дазваляе мне скарыстаць набыты вопыт, веды, у тым ліку і чыста прафесійныя. Але не толькі ад мяне залежыць прыняцце станоўчага рашэння.

**— Ці згадзіліся б Вы зноў вярнуцца на пасаду намесніка Старшыні Савета Міністраў рэспублікі, калі б атрымалі такое запрашэнне?**

— Думаю, гэта нерэальна. Ды і справа зусім не ў пасадзе. Калі будзе магчымасць працаваць там, дзе спатрэбяцца мае сілы і здольнасці, я буду працаваць.

**— У Вас вялікі вопыт работы ва ўрадзе. На чым у першую чаргу павінен зараз засяродзіць сваю ўвагу ваш пераемнік Міхаіл Дзямчук?**

— Максімальна скарыстаць магчымасці, якія дае гістарычны момант — пачатак рэальнага суверэнітэту нашай Беларусі. Настойліва дамагацца, пераконваць усіх у тым, што надышоў такі момант, калі нельга ўжо больш адкладваць на заўтра клопат аб нацыянальным адраджэнні, аб праблемах культуры, эканоміць грошы на адукацыі... Інакш усе нашы намаганні па распрацоўцы эканамічных праграм не маюць будучыні.

**Гутарыў Мікола ДЗЯБЕЛА.**

У гасцях у муз

# На мінскай сцэне—«Карсар»

**У той час, калі карозія бездухоўнасці і агіднага камерцыялізму раз'ядае наша грамадства, прэм'ера балета «Карсар», якая прайшла ў суботу ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь, гучыць магутным пратэстам і надзеяй таксама, што мы ўсё ж выстаім перад страшэннай навалай, надзеяй на тое, што, паводле прароцтва Ф. Дастаеўскага, прыгажосць выратуе свет.**

Нацыянальны беларускі балет ужо адным фактам свайго існавання адмаўляе адчай, ён і сёння застаецца непатапляльным астраўком прыгажосці, да берагоў якога, як да свайго выратавання, цягнуцца людзі, што прагнуць духоўнасці і гармоніі.

Прэм'ера балета А. Адана «Карсар» прайшла пры аншлагу, што, апроч усяго іншага, сведчыць аб тым, што яна стала сапраўднай падзеяй у культурным жыцці беларускай сталіцы.

Упэўнены, што легендарны Байран, па матывах аднайменнай паэмы якога пастаўлены балет «Карсар», застаўся б цалкам задаволены перакладам на мову харэаграфіі яго твора. Балет «Карсар» на беларускай сцэне ў пастаноўцы народнага артыста РСФСР прафесара П. Гусева адраджае выдатныя традыцыі харэаграфіі Марыса Пеціпа, які надаў гэтаму балету славу шэдэўра сусветнай класікі. Мастацкае афармленне балета ў майстэрскім выкананні народнага мастака Рэспублікі Грузія Т. Мурванідзе, дзе традыцыйныя элементы пераплятаюцца з сучаснымі тэхнічнымі эфектамі, як і харавство артыстычных касцюмаў, стварылі непаўторную атмасферу прыналежнасці да драматычных падзей, што разгортваліся на сцэне, перадавалі багатыя адценні ўсходняга каларыту і аднаўлялі гістарычны кантэкст байранаўскай паэмы.

Гучныя апладысменты выпалі і на долю аркестра тэатра оперы і балета, яго музычнага кіраўніка, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР А. Анісімава.

Гэта быў грандыёзны спектакль, і калі ўпала заслона, публіка, падняўшыся са сваіх месцаў, раз за разам выклікала выканаўцаў на «біс», выказваючы ім удзячнасць за надзвычайнае свята танца і музыкі. Прыемна тое, што на фоне вядомых і тытулаваных артыстаў —У. Камкова, Ю. Раўкуця, Т. Шэметавец не згубілася новая генерацыя танцоўшчыкаў — А. Фурман, Т. Ярахавец. Але нават у такім сузор'і талентаў найярчэй зіхацела зорка В. Захарава, чыё майстэрства і самаадданасць у танцы паланілі залу.

**Анатоль МАЙСЕНЯ.**

Незвычайны ліст

# Уратуймася самі!

**Я звяртаюся да нацыянальна свядомых беларусаў, тых, хто хоча жыць у спрыяльным асяроддзі — этнічным, моўным, хто лічыць сябе пацярпелым ад Чарнобыля — натуральнага ці маральнага, хто хоча змяніць месца жыхарства ці лад жыцця.**

**Выйсце я бачу ў стварэнні такога асяроддзя — асобнага паселішча, тып і статус якога залежаў бы ад жадаючых у ім жыць. А пакуль я мяркую, што гэта будзе паселішча вясковага тыпу, то хацеў бы, каб адгукнуліся вяскоўцы і тыя, хто можа звязаць свой лёс з вёскай.**

**Разлічваю на моладзь, таксама на людзей у працаздольным узросце, якія могуць маральна і фізічна пачаць жыццё на новым месцы. Прафесія можа быць любая, хаця напачатку трэба будзе сябе пракарміць і зарабіць грошы.**

**Напішыце, калі ласка, у сваіх лістах, хто вы, адкуль, ваш узрост, дзе робіце, сямейнае становішча і г. д. Паколькі я нікога з вас не ведаю, то пакідаю за сабой права пэўнага адбору.**

**Я мяркую, кожны атрымае адказ на свой ліст, і мы ў хуткім часе збяромся разам на сход, дзе я прапаную сваю праграму, і мы пагаворым аб усім больш падрабязна. Сачыце таксама за «Народнай газетай».**

**Сваё прозвішча я пакуль што не называю з-за пэўных нагодаў.**

**Мне 36 гадоў, беларус, жыву і працую пакуль што ў горадзе, маю сям'ю, бацькі мае жывуць у вёсцы.**

**Пішыце мне на адрас: 212030 г. Магілёў, паштамт, да запатрабавання, на пашпарт — ВН № 621929.**

## Не все так плохо!

Плата здесь чисто символическая. Всего за один рубль в профилактории «Купалинка» гродненского производственного объединения «Азот» сотрудникам предприятия предоставляются двухместный номер и все условия для поправки здоровья. Впрочем, самому объединению каждые сутки к этому рублю приходится докладывать еще семьдесят.

Не одну тысячу ежегодно выделяет из своих средств предприятие на реализацию принятой здесь социальной программы. Забота о человеке проявляется и в большом, и в малом. Так, у работников объединения не возникает проблем, если к какому-либо торжеству необходим букет цветов. Достаточно лишь подать заявку в свое тепличное хозяйство. Собственная станция технического обслуживания, оснащенная новейшим диагностическим оборудованием венгерской фирмы «Елкон», избавила от многих забот автолюбителей. Скоро появится свой колбасный цех. А в поселке Береговой растут заводские коттеджи, где справит новоселье не одна счастливая семья.

**НА СНИМКАХ:**
● Слесарь высшей квалификации Андрей НЕТНЕВ проверяет автомобиль на диагностической установке «Елкон».
● Аппаратчица Тамара ТЕРЕНТЬЕВА отдыхает в профилактории «Купалинка» с сыном Сашей.

**Фото Александра ТОЛОЧКО (БелТА).**

# Сексотом можешь ты не быть...

**В Минске прошел съезд Национально-демократической партии Беларуси.**

Все по той же причине — за дискредитацию НДПБ и несогласование с Вышней радой его интервью газете «Свободные новости» под заголовком «Я был сексотом КГБ» из высшего руководящего органа партии исключен Алесь Емельянов. После того, как за это решение высказалось большинство делегатов съезда, А. Емельянов и с ним еще четыре человека заявили о своем выходе из НДПБ.

Обсуждение этого вопроса заняло много времени, и потому принятие программы партии отнесли на последующий ее конгресс. Отложено и принятие заявления в отношении Виленского края. По сведениям агентства «БелаПАН», в документе не обойдется одной лишь констатацией факта о несогласованности с Беларусью осуществленной десятки лет назад передачи Вильни и других районов Литве.

Председателями партии избраны кандидаты физико-математических наук Анатолий Астапенко и Виктор Науменко, историк Микола Ермалович.

**Агентство «БелаПАН».**

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

## Неверагоднасці свету

# НОВАЯ СТРАШНАЯ ХВАРОБА ЦІ ПРАКЛЯЦЦЕ ІНКАЎ?

**Анна Марыя Рамэа перажывае кашмар, які паволі, але незваротна нішчыць яе мару — стаць найлепшай у свеце манекеншчыцай.**

**Палова твару Анны Марыі — сама прыгажосць. Другая палова старэе з кожным днём.**

Анне Марыі Рамэа 21 год, і на столькі яна выглядае з левага боку. З правага боку — сівізна, маршчыны, барадаўкі і плямы на твары робяць яе сямідзесяцігадовай бабулькай.

Вядомая бразільская манекеншчыца, якая валодала тытулам «Міс Прыгажосць» сваёй краіны, уцякла ад сяброў і блізкіх, парвала адносіны з жаніхом і закрылася ў адзіноце, перажываючы сваю драматычную і страшную метамарфозу. Штосьці накшталт таго, як у «Партрэце Дарыяна Грэя» ці «Доктара Уіклі і містэра Хайда»...

— Для мяне гэта катастрофа, трагедыя,— расказвала журналістам засмучоная жанчына на сустрэчы ў Рыо-дэ-Жанейра. — Ужо тры месяцы адна мая палова паміраe. Я толькі-толькі збіралася заключыць выдатны кантракт як манекеншчыца, мяне чакала турнэ па Амерыцы і Еўропе. Цяпер канец... Слепне правае вока, вяне скура, абвісае куточак рота, з аднаго боку выпадаюць зубы. Напэўна, лепш памерці ,чым гэта перажыць.

Самыя знакамітыя дэрматолагі, герыятры, нават спецыялісты па трапічных хваробах па чарзе даследавалі Анну Марыю.

— Пакуль што мы не можам знайсці навуковага тлумачэння гэтаму працэсу,— сказаў вядомы бразільскі герыятр доктар Альфонса Касілара. — Будзем працягваць даследаванне, але вымушаны прызнаць, што ў дадзены момант шанцаў на адваротны працэс ці хоць бы на яго спыненне няма.

Што гэта? Першая атака новага невядомага віруса? Нешта накшталт СНІДУ?

Тэрэза Рамэа, маці Анны Марыі, мае на гэты конт іншае тлумачэнне. Яна перакanана, што трагедыя дачкі — вынік дапушчанага ёю святатацтва.

— Мы наведалі руіны свяшчэннага горада інкаў Маху Пікху,— расказвала яна.— Гэта ў гарах Перу. Нам паказалі рэшткі святыні са славутым алтаром, да якога нельга датыкацца, бо на яго накладзены праклёны. Анна Марыя не паслухалася перасцярогі. З прыроджанай легкадумнасцю паклала руку на каменны алтар, а потым фрывольна разлеглася на ім для фатаграфавання. Назаўтра з правага боку твару скура звяла і з'явіліся першыя маршчыны...

(Па матэрыялах замежнага друку).





## Из жизни правнуков Остапа Бендера

# А славы так хочется...






Многие республиканские газеты откликнулись на посещение Минска никому неизвестным в Беларуси велосипедистом и гитаристом из города Ярцево Геннадием Чернецовым (Санбоем).

Надо признать, что не сделать это было трудно, так как экстравагантный молодой человек сам заходил в каждую редакцию и рассказывал о своей необычной жизни. О планах: поездка на велосипеде в Марокко; о трагедии: любимый велосипед украли в Борисове; о бесчеловечных бюрократах: главный бухгалтер Минского мотовелозавода не желает подарить ему новый велосипед. Рассказ журналистов впечатлял, и чеканились газетные строки, и поблескивали глянцем фотографии героя, и умилялись читатели.

И все бы ничего, если бы не показалось Геннадию этого мало. Огромные надписи «Санбой» появились в подземном переходе метро «Плсщадь Победы» (соскоблена уборщицей через три дня), на стене Виктора Цоя возле надписи «Джон Леннон» (замазана через сутки поклонниками последнего), на доме возле театра им. Я. Купалы (красуется еще и теперь), в других местах города.

Что поделаешь — очень хочется человеку оставить потомкам память о себе. «Народная газета», разумеется, ничего не имеет против этого. Но, уважаемый Санбой и другие правнуки О. Бендера, одна просьба: не пишите на стенах, в подземных переходах. Это непрактично и недолговечно. Хотите славы — заходите лучше в редакцию белорусских республиканских газет. Там всегда найдется кто-то, кому можно будет навешать лапши на уши.

Успехов вам в этом благородном деле.

Сергей ПЛЫТКЕВИЧ.

НА СНИМКАХ: «Санбой». Фото автора.

## Спорт-экспресс

### ФУТБОЛ

Встреча московских торпедовцев и динамовцев Киева, которая проходила 2 ноября на московском стадионе «Торпедо», должна была определить третьего призера чемпионата страны. На 69-й минуте игры дебютант сезона Алексей Юшков забил гол, который оказался «бронзовым» для его команды. Торпедовцы обеспечили себе право участвовать в сезоне 1992/93 годов в Кубке УЕФА.

7 ноября торпедовцы принимают в ответном матче кубка УЕФА чехословацкую команду «Сигма» из города Оломоуц.

Результаты других матчей: «Локомотив»—«Спартак» (Владикавказ) — 1:2 (0:1), «Спартак»—«Металлург»—2:1 (0:0), «Динамо» (Минск) — «Арарат» — 0:0, «Черноморец» — «Памир» — 1:0 (0:0).

**Вот итоговая таблица чемпионата:**

| | В | Н | П | М | О |
|---|---|---|---|---|---|
| ЦСКА | 17 | 9 | 4 | 57-32 | 43 |
| «Спартак» (М) | 17 | 7 | 6 | 57-30 | 41 |
| «Торпедо» | 13 | 10 | 7 | 36-20 | 36 |
| «Черноморец» | 10 | 16 | 4 | 39-24 | 36 |
| «Динамо» (К.) | 13 | 9 | 8 | 43-34 | 35 |
| «Динамо» (М.) | 12 | 7 | 11 | 43-42 | 31 |
| «Арарат» | 11 | 7 | 12 | 29-36 | 29 |
| «Динамо» (Мн.) | 9 | 11 | 10 | 29-31 | 29 |
| «Днепр» | 9 | 10 | 11 | 31-36 | 28 |
| «Памир» | 7 | 13 | 10 | 28-32 | 27 |
| «Спартак» (Вл.) | 9 | 8 | 13 | 33-41 | 26 |
| «Шахтер» | 6 | 14 | 10 | 33-41 | 26 |
| «Пахтакор» | 9 | 7 | 14 | 37-45 | 25 |
| «Металлург» | 9 | 7 | 14 | 27-38 | 25 |
| «Металлист» | 8 | 9 | 13 | 32-43 | 25 |
| «Локомотив» | 5 | 8 | 17 | 18-47 | 18 |

### ГАНДБОЛ

Спортсмены минского СКА выиграли в субботу первый матч 1/8 финала розыгрыша кубка Международной федерации гандбола (ИГФ) у клуба «Жиронден» (Бордо) — 32:24.

Ответная встреча — 10 ноября в Минске.

Спортсмены астраханского «Динамо» выиграли дома первый матч 1/8 финала розыгрыша кубка обладателей кубков у французского клуба «Венисcье-85» (Лион) — 21:15 (10:7).

Ответная встреча — 10 ноября во Франции.

### ТИРАЖ «СПОРТЛОТО»

Результаты 44-го тиража лотереи «Спортлото» «6 из 45» и «5 из 36».

«6 из 45»: 8 (велоспорт), 20 (парусный спорт), 26 (современное пятиборье), 29 (стрельба стендовая), 35 (хоккей с шайбой), 44 (шахматы).

«5 из 36»: 18 (легкая атлетика), 19 (лыжные гонки), 20 (парусный спорт), 27 (стрельба из лука), 30 (тяжелая атлетика).

(ТАСС).

## Послушайте умного человека!

# ...И поверьте: ваш гость все равно не полезет под шкаф

*Праздники у нас всегда на нервах. Бешеный кросс по магазинам, катастрофически пустеющий кошелек, уборка, кухня.*

*Но вот уже гости в квартире — сервировка, снова мытье тарелок, чтобы сменить приборы, а тут звон разбитой рюмки, кто-то звонит в дверь... Все на нервах. Однако стоп! Так быть не должно.*

*Профессор Джон Браун из Мичиганского университета (США) считает это «праздничным стрессом» и советует, как его избежать.*

- Стол не должен ломиться от закусок, а холодильник — трещать по швам. Еда на празднике — не главное. Главное — настроение. Семейная атмосфера, уют, веселье.
- Не старайтесь всю квартиру вычистить до блеска. Никто к вам под шкафы заглядывать не станет.
- Праздничные открытки отправьте только тем, от кого Вы получили их в прошлом году. Пожелания высказывайте попроще, с юмором, чтобы самому при этом не тяготиться сочинением текста.
- Не превращайте праздник в цепь дружеских визитов. Это действует угнетающе. Тщательно спланируйте дни.
- Если у Вас есть дети, пусть они вам помогут. Они будут этим поручением гордиться.
- Заранее запланируйте сумму расходов на праздники и ни при каких обстоятельствах не превышайте ее. Финансовый стресс — самый неприятный.
- Не старайтесь, будучи хозяином, развлекать гостей. Их прекрасно развлечет телевизор. Будьте естественны, как всегда.
- Поосторожнее со спиртным. Ибо послепраздничное самочувствие может испортить все впечатление.
- Делайте все не спеша и с улыбкой.



## Погода

**Сегодня днем по республике ожидается облачная с прояснениями погода. Временами дождь. Температура воздуха: в Гомеле, Могилеве — 2—4, Витебске — 3—5, Минске — 4—6, Гродно — 5—7, Бресте — 7—9 градусов тепла.**

**В последующие двое суток ожидается облачная с прояснениями погода, местами осадки. Температура воздуха ночью минус 3 плюс 2, днем — 0 плюс 5 градусов.**

## Вам збіраюцца паказаць...

### «Я аб'яўляю вам вайну»

... Падпалкоўнік Ярохін, трапіўшы пад скарачэнне Узброеных Сіл, вымушаны пайсці ў адстаўку. Ён вяртаецца ў горад свайго юнацтва, дзе адстаўніку падрыхтавана зусім не радасная сустрэча. У адзін з першых дзён Ярохіна збіваюць малойчыкі з банды рэкеціра Фамы. Былы афіцэр Савецкай Арміі ўступае ў праціборства з мясцовымі мафіёзі... Такі коратка сюжэт новай каляровай мастацкай кінастужкі «Я аб'яўляю вам вайну», створанай рэжысёрам Яраполкам Лапшыным на Свярдлоўскай кінастудыі па сцэнарыю Валянціна Чорных.

У ролі супермена Ярохіна — Мікалай Яроменка.

У фільме здымаліся таксама Анжэліка Няволіна, Алена Тонунц-Какалеўская, Генадзь Сайфулін, Алег Корчыкаў.

### «Нью-Йорк, 4 раніцы»

Так называецца каляровая мастацкая кінакарціна, знятая польскімі кінамайстрамі. Аўтары сцэнарыя—Кшыштаф Краузе, Анджэй Разасланец і Ян Томчак, — рэжысёр Кшыштаф Краузе.

Дзея фільма адбываецца ў правінцыяльным польскім гарадку.

Галоўныя ролі выконваюць Ганна Войтан, Януш Юзэфовіч, Рышард Мруз, Івона Паўляк, Кшыштаф Кавалеўскі.

### «Канец старых часоў»

Гэту каляровую чэхаславацкую мастацкую кінастужку паставіў вядомы рэжысёр Іржы Менцаль на кінастудыі «Баранданў» па матывах аднайменнага рамана Уладзіслава Ванчуры.

У фільме здымаліся Йозаф Абрхам, Ярамір Ганзлік, Рудольф Грушынскі, Ян Гартл і іншыя.

### «Студэнтка»

Фільм знялі сумесна кінематографісты Францыі і Італіі. Аўтары сцэнарыя — Клод Пінота і Даніэль Томпсан, рэжысёр Клод Пінота.

Многія лічаць, што гэта карціна з'яўляецца трэцяй часткай «Бума». Рэжысёр той жа. Актрыса — пасталелая і стаўшая ўжо прызнанай «зоркай» Сафі Марсо — тая ж. І зноў — гісторыя кахання, толькі не школьнага ўжо, а, як сведчыць назва, студэнцкага.

### «У чаканні зыходу»

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — А. Кібкала пры ўдзеле А. Гельмана, рэжысёр — А. Кібкала.

Гэта фільм-роздум аб лёсе Расіі, праблемах яе сённяшняга жыцця, аб пошуках шляхоў адраджэння. У карціне прымаюць удзел паэт і філосаф Уладзімір Мікушэвіч, мастак Юрый Селіверстаў, гісторык Валерый Лебедзеў, лідэр таварыства «Памяць» Дзмітрый Васільеў і іншыя.



## Из студии «Татьяна»

# К сердцу людей

**Вот уже месяц в Беларуси работает кинодокументалист из Гамбурга Ханнес Геер.**

Около двух лет назад по немецкому телевидению была показана картина Элема Климова и Алеся Адамовича «Иди и смотри». Она и подтолкнула Ханнеса к созданию своего фильма о войне. Он рассчитан прежде всего на немецкого зрителя и, по замыслу автора, должен отличаться от всех ранее созданных картин на военную тему.

По словам Ханнеса Геера, он должен донести своим зрителям правду о концентрационных лагерях, центральную роль он отводит минскому гетто. Будет показана работа служб СС и СД. Но зрители не увидят, как обычно, руководителей, отдававших приказы, перед ними пройдут исполнители, «рабочие», чье ремесло — убийство. Они, «отработав» 8—9 часов, спокойно засыпали, писали близким теплые письма.

Определенные трудности возникают при подборе материалов: главный источник — документы процессов над военными преступниками, проходивших в 50—60-х годах. К советским архивам немецкому кинодокументалисту просто не добраться.

Хоть официальных документов и недостаточно, тем не менее Ханнес не планирует показывать в фильме партизан и ветеранов. Их рассказы о том времени не лишены вымысла. «Мне нужны не герои, которые утонули в славе и забыли о действительности, мне нужны никому неизвестные люди, побывавшие в жерновах этой истории»,—говорит Ханнес Геер.— Я должен спешить: свидетелей и очевидцев становится все меньше, одни умирают, евреи покидают вашу страну».

Съемки он планирует закончить в октябре 1992 года, а работу над фильмом «Место работы»— зимой 1993 года.

И последнее, к читателям. **Если вы располагаете какими-то личными документами (дневники, письма) того времени или можете сообщить что-нибудь интересное, ваши письма ждут по адресу: г. Минск-50, ул. К. Маркса, 5, комната 37, студия «Татьяна». Ханнесу Гееру.**

Елена КОРУНЕЦ.






**5—6 НОЯБРЯ**
Начало в 19.00

**ТЕАТР ОПЕРЫ И БАЛЕТА**
сегодня—**«Фауст»**, завтра —премьера **«Корсар»**.

**ТЕАТР ИМ. Я. КУПАЛЫ**
завтра—**«Здешние»**.

**ТЕАТР ИМ. М. ГОРЬКОГО**
сегодня—**«В будущем году, в это же время»**, завтра — **«Аморальная история»**.

**ТЕАТР КУКОЛ**
завтра — **«Мышонок Мыцык»** (10.30 и 12.30).

**БЕЛГОСФИЛАРМОНИЯ**
(концертный зал)

сегодня — **Белорусский государственный хореографический ансамбль «ХОРОШКИ»**, художественный руководитель — **В. Гаевая.** Хореографическая композиция «По страницам Полоцкой тетради»,

завтра — **благотворительный концерт** в фонд строительства храма-памятника в честь иконы Божьей матери «Всех скорбящих Радосте», в память всех пострадавших от чернобыльской беды. **Белорусский государственный хореографический ансамбль «ХОРОШКИ»**, художественный руководитель — **В. Гаевая.** Хореографическая композиция «По страницам Полоцкой тетради»;

(зал камерной музыки)
сегодня—СОНАТНЫЙ ВЕЧЕР. **Раймундас Катилюс** (скрипка), **Антанас Смятона** (фортепиано) США. В программе—Бетховен,

завтра — К 25-ЛЕТИЮ ТВОРЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ. **Концерт вокальной музыки «МОИ ЛЮБИМЫЕ АРИИ».** Солистка ГАБТа Беларуси **И. Одинцова** (сопрано). Партия фортепиано — **Н. Сердобов.** В программе — Бах, Гендель, Скарлатти, Пёрселл, Перголези, Верди.

# Программа телепередач

## Вторник, 5 ноября

**Программа БТ**

**8.30.** Утро республики.
**8.45.** «Отступник». Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
**11.20.** Док. фильм.
**11.30.** Дом на Чистых прудах.
**13.00.** «Трава зелена». Худ. фильм. 1-я серия.
**14.05.** Ритмическая гимнастика.
**14.35.** Тайны Пражского архива.
**16.30.** «Легкие шаги». Худ. фильм.
**18.00.** Люблю я эту землю. Совхоз «Беларусь» Жабинковского района.
**19.00.** Панорама.
**19.25.** Наш комментарий.
**19.30.** О чем шумят вокзалы?
**20.00.** Зачитайте мое письмо...
**20.05.** Док. фильм.
**20.20.** Чернобыль: проблемы и решения. Социальная защита граждан.
**20.40.** Реклама.
**20.45.** Колыбельная.
**21.00.** «Зимородки». Док. фильм.
**21.40.** Телебиржа.
**21.55.** «Отступник». Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
**0.30.** Эхо дня.

**Первая программа**

**6.30.** Утро.
**9.00.** Премьера худ. фильма «Мать». Фильм 2-й.
**11.15.** В дни школьных каникул. «Вместе с чемпионами».
**12.00.** ТСН.
**12.15.** «Долой Огуречного короля». Телеспектакль.
**13.40.** Биржевые новости.
**13.55.** Детский музыкальный клуб.
**14.10.** Блокнот.
**14.15.** Телемикст.
**15.00.** ТСН.
**15.15.** «Пикью-00 и другие...» Док. фильм.
**16.15.** «Мелодия на два голоса». Худ. фильм. 2-я серия.
**17.30.** ...До 16 и старше.
**18.15.** Презентация худ. фильма «Машенька».
**18.30.** ТСН.
**18.45.** Премьера худ. фильма «Мать». Фильм 2-й.
**21.00.** Информационная программа.
**21.40.** Звезды мировой оперной сцены.
**22.40.** Семейная хроника старых знакомых. Премьера телефильма «Алеша». 1-я и 2-я серии. В перерыве **(22.35)** —Биржевые новости и ТСН.
**0.55.** Беседы с епископом В. Родзянко. Передача 18-я.
**1.25.** Премьера худ. фильма «Мать». Фильм 2-й.

**Российский канал**

**8.00.** Гимнастика.
**8.20.** Док. фильм.
**8.40, 9.10.** Французский язык.
**9.40.** «Оглянись, Россия!»
**10.40.** Премьера док. фильма «Как сочинять оперы».
**11.00.** «Другое искусство». Передача 1-я.
**17.00.** А. П. Чехов. «Дядя Ваня».
**17.45.** Школа менеджеров.
**18.15.** Концерт.
**18.30.** Деловая женщина.
**19.00.** Парламентский вестник России.
**19.15.** «Дальний Восток».
**20.00.** Вести.
**20.20.** Спокойной ночи, малыши!
**20.35.** СКВ.
**20.45.** Визитная карточка.
**21.30.** Елена Соловей.
**22.00.** Музыкальная коллекция.
**22.25.** От за от. «Острова раздора».
**23.00.** Вести.
**23.20.** Теннис. «Кубок Кремля».

# Кино

## 5 ноября

Справочная киносети — 20-90-90.

**«МОСКВА»:** программа док. фильмов **«Эра милосердия»** (предсеансовый зал). **«Виват, гардемарины!»** (2 с., п) — 11.30, 21.40. **«Галаксина»** — 9.40, 14.10 (л), 16.00, 18.00, 19.50. Видеозал: в цикле «Политический детектив». **«Без выхода»** (США) — 16.45, 18.45, 20.30.

**«ОКТЯБРЬ»: «Виват, гардемарины!»** (2 с.), (п) — 10.00, 14.25, 17.00, 21.25. **«Галаксина»** — 12.35 (л), 19.35.

**«АВРОРА»: «Принц-привидение»*** — 10.00, 14.40, **«Самсон и Салли»*** — 11.50, 13.20. **«Десять лет без права переписки»**** — 17.00, 19.00, 21.10. **«Иллюзия смерти»** (п) — 10.10, 12.10, 14.10, 16.00, 17.50, 19.40, 21.30. **«Галаксина»** — 10.30, 14.30, 16.30, 18.30 (удл.). **«Отпетые мошенники»** (1,5 с.) — 12.20, 21.00.

**«БЕРЕСТЬЕ»: «Самсон и Салли»*** (кинопраздник «Здравствуй, осень золотая») — 10.30. **«Мария, Мирабелла»** (кинопраздник «Здравствуй, осень золотая») — 14.30. **«Деловая женщина»** (1,5 с., п)** — 9.30, 11.40, 13.50, 17.40, 19.50, 22.00 (н). **«Мона Лиза»** —12.30 (к/пр., л). **«Налево от лифта»** — 16.30. Ко Дню советской милиции **«Криминальный квартет»** — 18.30, 20.30 (удл.).

**«ВИЛЬНЮС»: «Виват, гардемарины!»** (2 с., п) — 10.00, 14.00, 18.00. **«Галаксина»**—12.20, (л), 16.20, 20.20, 22.00 (н). Видеозал: **«Легенда о золотой жемчужине»** (США) — 13.20, 17.30. **«Иллюзия убийства»** (США) — 15.25, 19.35, 21.40.

**«ДРУЖБА»: «Иллюзия смерти»** (п) — 10.00, 14.10, 16.00, 17.50, 19.40, 21.30. **«Десять лет без права переписки»**** —12.00. Видеозал: (США) **«Голливудские мечты»** — 14.00, 17.40, 21.10. **«Моя мачеха — инопланетянка»** — 15.40, 19.20.

**«ПАРТИЗАН»: «Иллюзия смерти»** (п)—14.20 (л), 18.10. **«Звездные войны»** (1,5 с.) — 10.00, 12.10, 16.00, 19.50, 22.00 (н).

**«ПОБЕДА»: «Рембо. Первая кровь»** — 10.00, 14.00 (л), 16.00, 18.00, 21.40. **«Иллюзия смерти»** — 12.00, 19.50. Видеозал: **«Полицейский и бандит»** (ф. 1-й) — 11.00, 14.20, 17.50, 21.10, (ф. 2-й) — 12.40, 16.10, 19.30. Видеосалон, видеокафе: **«Привидение»** — 11.10, 13.30, 15.50, 18.10, 20.40.

**«КИЕВ»: «Ну, погоди!»*** — 10.00. **«Смертельный микроб»** — 12.00 (л), 18.40. **«Враг»** (2 с.) — 16.00, 20.40. **«Мистер Питкин в тылу врага»** —14.00.

**«ПИОНЕР»: «Самсон и Салли»*** (премьера) — 10.00, 11.30. 12.50. **«Все впереди»** — 14.20. **«Женщина в подарок»** (1,5 с.) — 16.00, 18.20, 20.40. Видеозал: **«Трое из Простоквашино»*** — 10.00, 15.00. **«Это страшное местечко Салем»** — 11.30, 16.30, 18.30. **«Миссия в Маниле»** — 13.30, 20.40.

**«МИР»: «SOS над тайгой»** (стерео) — 13.10, 14.40. **«Деловая женщина»** (1,5 с., п)** — 9.40, 11.40, 13.50, 17.40, 19.50, 22.00 (н). **«Океан»** (2 с.) — 10.10 (л), 16.10, 18.50, 21.30. **«Мона Лиза»** — 16.00.

**«ЭЛЕКТРОН»: «Мистер Пронька» и др. мультфильмы*** — 10.00. **«Принц-привидение»*** — 10.10. **«Горячая цель»** (п)** — 12.20, 14.20, 16.20, 18.20, 20.20. **«Жертва во имя любви»** (2 с.) — 11.20, 14.00, 16.40, 20.00. Видеозал: **«Дик Трейси»** — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00. **«Тысячелетие»** — 10.10, 12.10, 14.10, 16.10, 18.10, 20.10.

**«ЦЕНТРАЛЬНЫЙ»: «Царская охота»** (2 с.) — 12.20, 18.00. **«Горячая цель»** (п)** — 9.00, 10.40 (л), 14.40, 16.20, 20.20, 22.00 (н).

* — для детей,
** — только для взрослых,
(л) — льготный,
(п) — премьерный показ.





НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгіналаў.

Рэдакцыя «НАРОДНАЙ ГАЗЕТЫ» прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы. Даведкі часова па тэлефоне 29-66-59.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220010, Мінск, Дом урада, пакой 369, тэл. 29-65-50.

ИНДЕКС 63868.
Выходит ежедневно, кроме воскресенья и понедельника, 250 раз в году.

Тираж 300 тыс. экз.

Подписана в печать в 19.10.

Газета отпечатана в типографии издательства «Белорусский Дом печати».
Способ печати — офсетный, формат А-2.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар
Іосіф СЯРЭДЗІЧ.